# ЭМІЛІЯ ПЛЯТЭР: ГРАФІНЯ, ФАЛЬКЛАРЫСТКА, КАМАНДЗІР ПАЎСТАНЦАЎ

## Жыццёвы шлях змагаркі за пераўладкаванне сацыяльнага ладу жыцця



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**У Адама Міцкевіча ёсць рамантычна ўзнёслы верш «Смерць палкоўніка». Паэт усхвалявана апісвае апошнія хвіліны жыцця змагара за свабоду Айчыны. Толькі ў заключных радках чытач даведваецца, што камандзірам касіянераў была дзяўчына: «То ліцвінка Эмілія Плятэр!». Вобраз нашай славутай суайчынніцы ўвасоблены і ў выяўленчым мастацтве: прыгадаем манументальнае палатно Яна Разена «Эмілія Плятэр на чале касіянераў у 1831 г.», карціну Войцэха Косака «Эмілія Плятэр у баі пад Шаўлямі», партрэт Эміліі Плятэр, напісаны Карлам Меерам. Імя гэтай мужнай дзяўчыны носіць адна з цэнтральных вуліц Варшавы, у шэрагу еўрапейскіх краін у яе гонар узведзены помнікі. Чым жа заслужыла такі гонар 25-гадовая ліцвінка, названая сучаснікамі беларускай валькірыяй*?**

### Захапленні юнацкіх гадоў

Эмілія Плятэр нарадзілася ў Вільні 13 лістапада 1806 г. Яе бацьку, графу Францу Броель-Плятэру, належылі вялікія зямельныя тэрыторыі ў Віцебскай губерні. Светапогляд нашай гераіні фарміраваўся пад уплывам ідэй, якія прапаведвалі філаматы і філарэты – прадстаўнікі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пачатку XIX ст. Нягледзячы на арыстакратычнае паходжанне, юная графіня ўсёй душой жадала паляпшэння становішча простага народа, да жыцця якога заўсёды праяўляла шчырую цікавасць. Выразную характарыстыку Эміліі Плятэр даў у сваіх мемуарах вядомы рэвалюцыянер, сасланы ў Сібір, Максіміліян Маркс. Ён адзначаў, што гэтая дзівосная дзяўчына з запалам, уласцівым чулым і высакародным сэрцам, аддалася душой беларускаму люду, спачувала яго нягодам, імкнулася знайсці спосабы, каб дапамагчы яму [2, с. 234–235]. Свабодалюбівыя ідэі Адама Міцкевіча, Тамаша Зана, Яна Чачота і іншых філаматаў знайшлі гарачы водгук у сэрцы юнай графіні. Як і яны, Эмілія вырашыла прысвяціць жыццё служэнню свайму народу. Яе героямі становяцца не персанажы раманаў пра каханне, а рэальныя людзі: Тадэвуш Касцюшка, Жана д'Арк. Іх партрэты заўсёды знаходзіліся ў асабістых пакоях дзяўчыны. Эмілія з захапленнем чытала і добра ведала творы А. Міцкевіча і Т. Зана. Асабліва ёй падабалася паэма «Гражына», у якой дзяўчына знаходзіла сугучныя ўласным перакананням думкі, погляды, ідэалы. Ужо ў падлеткавым узросце Эмілія пачынае мэтанакіравана рыхтаваць сябе да суровага, напоўненага небяспекай і выпрабаваннямі лёсу змагара за



* Валькірыі – у скандзінаўскай міфалогіі ваяўнічыя дзевы-багіні, якія дапамагалі героям у бітвах.



пераўладкаванне сацыяльнага ладу. Юная графіня асвойвае навыкі верхавой язды, стральбы з агністрэльнай зброі, фехтавання.

Калі Эміліі было дзевяць гадоў, яе бацькі скасавалі шлюб. І дзяўчынка з маці Ганнай Моль перасяляецца ў радавы маёнтак Ліксна на Віцебшчыне, непадалёк ад Дынабурга (сёння Даўгаўпілс). Тут цікаўная дзяўчына прагна вывучае народную культуру, асабліва песенную творчасць. У святочныя дні ў простым адзенні юная графіня наведвае кірмашы, народныя гулянні, ігрышчы, дзе запісвае вясковыя песні, а заадно засвойвае манеру іх выканання. Асабліва падабаліся Эміліі плачы-галашэнні, якія і яна сама спявала па-майстэрску. Так, яе знаёмых уражвала амаль аўтэнтычнае выкананне графіняй народнай песні: «Авой, авой, дзяцюк ты мой! / Не на радасць, не на шчасце ты нарадзіўся».

Збіраць фальклор Эміліі дапамагалі шматлікія карэспандэнты як з простанароддзя, так і з асяроддзя шляхціцаў. За дастаўленыя ёй фальклорныя творы графіня шчодра плаціла, асабліва вясковым выканаўцам. Значную колькасць народных песень Эмілія апрацоўвала і выконвала пад фартэпіяна. На гэтым музычным інструменце ёй удавалася пераканаўча і выразна перадаць радасць і тугу народных матываў і нават імітаваць тэмбр сапрана-жалейкі і баса-дуды. У сваіх экспедыцыях па Віцебшчыне фалькларыстка збірала і харэаграфічны фальклор, а шэраг народных танцаў па-майстэрску выконвала сама. Напрыклад, як сведчыць польскі даследчык В. Брухнальскі, дзяўчына любіла танцаваць пад дуду вясёлую «Лепятуху».

А яшчэ гэта дзівосная графіня пісала вершы на беларускай мове. Асабліва ўдаваліся ёй паэтычныя творы, стылізаваныя пад народны мелас. Шкада, што і шматлікі фальклорны матэрыял, сабраны Эміліяй Плятэр, і яе ўласныя творы пакуль не знойдзены. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што ўсё гэта можа знаходзіцца ў яшчэ не даследаваных расійскіх паліцэйскіх архівах. Справа ў тым, што жандармерыя Расійскай імперыі скрупулёзна даследавала прычыны паўстання 1830–1831 гадоў і збірала самыя разнастайныя звесткі аб яго ўдзельніках і асабліва яго кіраўніках.

## На чале атрада паўстанцаў

Напярэдадні паўстання Эмілія з маці адпраўляюцца ў падарожжа па Еўропе. Шмат дзён яны праводзяць у Варшаве і Кракаве, дзе ў строгай сакрэтнасці распрацоўваўся план барацьбы за незалежнасць былых тэрыторый Вялікага Княства Літоўскага ад расійскага самадзяржаўя. У Польшчы юная патрыётка знаёміцца з некалькімі прадстаўнікамі канспіратыўнага камітэта. Мяркуюць, што пра будучае паўстанне графіня даведалася ад прафесара Віленскага ўніверсітэта І. Лялявеля. Без ваганняў Эмілія Плятэр прымае рашэнне стаць у шэрагі касіянераў.

Паўстанне выбухнула 29 лістапада 1830 г. у Варшаве. Яго актыўна падтрымалі жыхары горада і польскія вайсковыя часці. Пад націскам паўстанцаў расійскія войскі вымушаны былі пакінуць тэрыторыю Польшчы, значная частка іх спынілася на тэрыторыі Беларусі. У гэтай сітуацыі вельмі важна было затрымаць іх тут, не дазволіць пачаць контрнаступленне на Варшаву. З Польшчы ў Беларусь, Літву і Украіну былі накіраваны эмісары, каб узняць паўстанні і на гэтых тэрыторыях. У Варшаве па ініцыятыве І. Лялявеля з прадстаўнікоў беларускай, літоўскай, украінскай шляхты і інтэлігенцыі ствараецца «Клуб злучаных братоў». Яго актывісты звяртаюцца ў Сейм з заявай аб далучэнні патрыётаў Беларусі, Літвы і Украіны да паўстання. У студзені 1831 г. у Вільні ствараецца падпольны Цэнтральны паўстанцкі камітэт, на месцах фарміруюцца павятовыя камітэты. Прадстаўнікі камітэтаў вядуць вусную прапаганду мэт і задач паўстання, распаўсюджваюць звароты да насельніцтва, наладжваюць збор фінансавых сродкаў для набыцця зброі, амуніцыі, харчавання для касіянераў.

Эмілія актыўна ўключаецца ў справу падрыхтоўкі паўстання. Яна верхам на кані аб'язджае навакольныя мястэчкі і вёскі, наведвае сваякоў і прапаноўвае ім падтрымаць польскіх патрыётаў. У прыватнасці, разам са сваімі кузенамі Люцыянам і Фердынандам і іх сябрам А. Рыпінскім графіня абмяркоўвала план захопу Дынабургскай крэпасці, дзе размясціўся гарнізон расійскіх салдат, які адступіў з Польшчы. Рыпінскі ў гэты час быў слухачом школы прапаршчыкаў, якая знаходзілася ў крэпасці (дарэчы, у ёй адбываў пакаранне дзекабрыст В. Кюхельбекер. А. Рыпінскі сустракаўся з ім, дастаўляў яму літаратуру, абмяркоўваў падзеі паўстання ў Пецярбургу 14 снежня 1825 г.). Рыпінскаму было даручана пераконваць вайскоўцаў, якія знаходзіліся ў крэпасці, не аказваць супраціўленне касіянерам.

Сябры па вызваленчым руху прысвоілі Эміліі Плятэр званне Рыцара-дзевы. Неўзабаве яна наведвае Вільню, дзе ўзгадняе прыкладную дату пачатку паўстання на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Актыўныя дзеянні тут касіянеры меркавалі пачаць у сакавіку-красакавіку 1831 г. Вясной паўстанне ахапіла Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі, Дзісненскі, Свянцянскі паветы. 29 сакавіка ў адзенні касіянера, узброеная двума пісталетамі графіня апоўдні прыехала ў мястэчка Дусяты. На плошчы перад касцёлам пасля заканчэння набажэнства яна звярнулася да вернікаў з заклікам далучыцца да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паўстанцаў. Палымяныя словы Эміліі знайшлі водгук у сэрцах местачкоўцаў. Разам з Люцыянам Вайсянхофам графіня за кароткі час сабрала «партызанскі атрад у колькасці 280 стралкоў, 60 коннікаў і некалькіх соцень касіянераў» [1, с. 515]. Сярод паўстанцаў было нямала дзяўчат, якія бралі прыклад з адважнай патрыёткі. Так, ад'ютантам Эміліі была Марыя Прушынская, якая не пакідала свайго камандзіра да апошняй хвіліны жыцця графіні.

Баявыя дзеянні вырашана было пачаць з захопу Дынабургскай крэпасці. Яе гарнізон быў нешматлікі, а ўмацаванні слабымі, што давала касіянерам падставы спадзявацца на поспех. Па дарозе да крэпасці каля паштовай станцыі Даўгелі і мястэчка Язяросы атраду пад камандаваннем Эміліі Плятар удалося разграміць некалькі расійскіх вайсковых фарміраванняў. Пераможнай для паўстанцаў стала і бітва пад Уценай. Расійскі гарнізон вымушаны быў адступіць. Аднак захапіць Дынабургскую крэпасць паўстанцам не ўдалося. Яе камандаванне даведалася аб плане касіянераў, вывела з крэпасці лаяльна настроеных салдат і значна ўмацавала гарнізон дадатковымі сіламі. У баях за авалоданне крэпасцю паўстанцы панеслі значныя страты, але Эмілія настойвала на працягу змагання. На полі бою яна дэманстравала выключныя рашучасць і мужнасць, сваім прыкладам натхняла касіянераў-мужчын.

Пасля няўдачы пад Дынабургскай крэпасцю Эмілія і яе кузен Цэзар вырашылі злучыцца з іншымі паўстанцамі. З баямі атрад дайшоў да горада Панявежа (сёння Панявежыс) і сустрэў тут атрад К. Залускага, які мусіў адступаць пад напорам расійскіх войск. З'яўленне атрада Эміліі ўзняло баявы дух касіянераў Залускага, адбылося аб'яднанне двух паўстанцкіх фарміраванняў. Але новаму партызанскаму злучэнню процістаяла рэгулярнае расійскае ваеннае фарміраванне, якое значна пераўзыходзіла яго па колькасці. Паўстанцы дзень і ноч адбівалі атакі праціўніка. Атрад Э. Плятэр удзельнічаў ва ўсіх сутычках з царскімі салдатамі. Неаднойчы мужная дзяўчына рызыкавала сваім жыццём, некалькі разоў ледзь не трапіла ў палон. Так, у бітве за Коўна параненую Эмілію акружыла вялікая група расійскіх вайскоўцаў, толькі дзякуючы адвазе маёра Кекрніцкага, які аддаў дзяўчыне свайго каня і прыкрыў яе адступленне, Эмілія была выратавана. Пасля выздараўлення яшчэ не раз графіня ўдзельнічала ў цяжкіх баях. У бітвах за Вільню і Шаўлі яна праявіла выключную адвагу і знаходлівасць. З'яўленне ў шэрагах касіянераў камандзіра-дзяўчыны нязменна ўздымала баявы дух паўстанцаў. Ігнат Дамейка, які таксама быў удзельнікам паўстання, пакінуў нам такое апісанне Эміліі: «Да нас далучыўся даволі значны, добра абмундзіраваны конны аддзел паўстанцаў на чале з Плятэр. Ёй можна было даць не больш за 24 гады. Невялікая ростам, бледнатварая, не прыгажуня, але з авальным, прыемным, сімпатычным тварам, блакітнымі вачыма, стройнага, хоць і не моцнага складу. Была паважная, хутчэй суровая, чым свойская ў абыходжанні, малагаваркая і поглядам нібы патрабавала да сябе належных адносін і прыстойнасці. Дый ніхто ў лагеры не дазваляў у яе прысутнасці кінуць недарэчнае слова, жарт або паграшыць у ветлівым абыходжанні. На ёй быў шарачковы сурдут з чырвоным каўняром, а каля шыі карункавы каўнерык, што вельмі ёй пасавала. Невялікі мужчынскі ківер на галаве, валасы падрэзаныя, шырокія, да зямлі шаравары, на поясе кінжал і невялікая шабля, сярэбраныя шпоры на боціках. Сціплая, без усялякай ненатуральнай прэтэнзіі, зграбна трымалася на кані» [6, с. 64].

Летам 1831 г. атрад Э. Плятэр далучыўся да польскага корпуса, якім камандаваў генерал Д. Хлапоўскі. Ён вёў паспяховыя баі на Гродзеншчыне. Так, у Ражанцы (цяпер Шчучынскі раён) паўстанцы разбілі буйное расійскае вайсковае фарміраванне, захапілі падводы, сабраныя для перавозкі правіянту для расійскай арміі, а ў Лідзе атрымалі перамогу над дзвюма ротамі Віленскага рэзервовага пяхотнага батальёна. Ва ўсіх гэтых ваенных дзеяннях удзельнічала і Эмілія Плятэр са сваім атрадам. Камандаванне паўстанцкай арміі высока ацаніла яе смеласць і рашучасць і прызначыла ганаровым камандзірам 1-й роты 25-га лінейнага пяхотнага палка, прысвоіўшы званне капітана. Хлапоўскі прапанаваў графіні вярнуцца дамоў, каб падлячыцца пасля ранення, але мужная патрыётка адмовілася ад прапановы генерала і засталася побач з таварышамі па зброі.

Тым часам паўстанне пайшло на спад. Царскі ўрад аб'явіў ваеннае становішча на тэрыторыі Беларусі і Літвы, быў значна павялічаны кантынгент расійскіх войск, устаноўлены паліцэйскі нагляд за ўсімі падазронымі асобамі. Шмат патрыётаў было выслана ў глыб Расіі, маёнткі ўдзельнікаў паўстання канфіскоўвалі, а іх уладальнікаў аддавалі пад суд. Сялян, якія добраахвотна пакідалі паўстанцкую армію, не судзілі.

29 мая 1831 г. памёр ад халеры галоўнакамандуючы рускай арміі генерал-фельдмаршал І. Дзібіч-Забалканскі, на яго месца быў прызначаны генерал-фельдмаршал І. Паскевіч. Новы галоўнакамандуючы пачаў дзейнічаць больш рашуча і жорстка. Пад Вільна, на Панарскіх узгорках, 26-тысячнай рэгулярнай расійскай арміі ўдалося разграміць асноўныя сілы паўстанцаў. У гэтых жорсткіх баях прымала ўдзел і Эмілія Плятэр. Пасля сутыкнення пад Вільняй адбылася яшчэ адна буйная бітва – пад Шаўлямі. Роце, якой камандавала наша гераіня, было даручана ахоўваць абоз, але сітуацыя склалася так, што атрад Эміліі вымушаны быў прыняць і самы непасрэдны ўдзел у баі. Галоўнакамандуючы паўстанцкай арміяй у Беларусі і Літве генерал А. Гелгуд у рапарце адзначаў, што Э. Плятэр і тут праявіла надзвычайную адвагу.

На ваеннай нарадзе ў Куршанах Гелгуд прыняў, як потым высветлілася, памылковае рашэнне раздзяліць паўстанцкую армію на тры часткі, якія павінны былі дзейнічаць у трох розных кірунках. Рота Плятэр увайшла ў корпус Хлапоўскага, на якога Эмілія ўскладала вялікія надзеі. Але гэтыя надзеі не спраўдзіліся. Каб пазбегнуць канчатковага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разгрому з боку расійскіх войскаў, якія акружылі яго корпус, Хлапоўскі прымае рашэнне пакінуць Літву, перайсці ў Прусію і скласці зброю. Такое рашэнне Плятэр расцаніла як здраду. Эмілія ўсяляк імкнулася пераканаць генерала ў памылковасці яго рашэння, але той свайго загаду не адмяніў. Тады Эмілія пакідае корпус, які адыходзіць у Прусію, і спрабуе з адданымі ёй паўстанцамі прабіцца на тэрыторыю Польшчы. Яе мэта – далучыцца да тых польскіх паўстанцаў, што працягваюць супраціўленне царскай арміі. Касіянеры з вуснаў у вусны перадавалі словы, сказаныя мужнай дзяўчынай генералу Хлапоўскаму: «Лепш было б памерці з гонарам, чым закончыць такім сорамам. Шчаслівай дарогі, генерал! Што тычыцца мяне, пакуль іскра жыцця застаецца ў грудзях, буду змагацца за Айчыну!». Адданасць Эміліі справе вызвалення паспрыяла таму, што значная колькасць разззброеных у Прусіі касіянераў вярнулася ў Літву, каб зноў узняць сцяг паўстання супраць царызму.

## Жыццё пасля смерці

Паражэнне паўстанцкай арміі Эмілія Плятэр успрыняла надзвычай цяжка. Да эмацыянальнага стрэсу дадаліся страшэнныя фізічныя перагрузкі, празмерныя нават для загартаваных мужчын. Атрад Плятэр, акружаны расійскімі вайсковымі падраздзяленнямі, з баямі прайшоў усю Літву з поўначы на поўдзень. У рэшце рэшт фізічныя сілы пакінулі мужную патрыётку. Дзяўчыну-капітана ў непрытомнасці паўстанцы вымушаны былі пакінуць у маёнтку шляхціца Абламовіча, які спачуваў касіянерам. Там Эмілія знаходзілася пад чужым прозвішчам, выдадзеная за хатнюю настаўніцу яго дзяцей. Але ні шчырыя клопаты гаспадара, ні тагачасныя лекі не далі станоўчых вынікаў. Хворае сэрца Эміліі не вытрымала звесткі аб канчатковым паражэнні паўстання, і ў канцы снежня 1831 г. «беларуская валькірыя» пайшла з жыцця.

Пахавалі Эмілію Плятэр тайна на могілках вёскі Капчамесціс (Літва). Але яшчэ некалькі гадоў па беларускіх і літоўскіх землях хадзілі чуткі, нібыта графіня-касіянер жывая і працягвае змагацца за свабоду сваёй радзімы. Не знікала доўгі час імя Эміліі Плятэр і з перапіскі паліцэйскіх чыноўнікаў. Справа ў тым, што, паводле пастановы Віленскага губернскага праўлення, за ўдзел у паўстанні графіня была аднесена да 2-га разраду дзяржаўных злачынцаў. На падставе гэтага ўсе яе маёнткі і грашовыя капіталы канфіскоўваліся. З архіўных дакументаў бачна, што крымінальная справа аб маёмасці Эміліі Плятэр вялася з 1839 па 1849 г.

Патрыятызм, мужнасць, смеласць «беларускай валькірыі» былі ўвасоблены ў народных легендах, мастацкай літаратуры, выяўленчым мастацтве. Так, А. Міцкевіч у 1832 г. па свежых слядах трагічных падзей напісаў верш: «Людзі з вёсак збіраюцца тут, ля варот. / Ён, палкоўнік, быў слаўны, няйначай, / Раз яму спагадае так просты народ, / Пра яго ўсё пытае і плача... / Людзі з вёсак маліцца хутчэй пачалі, / Ціха ўкленчыўшы перад парогам. / Спалатнеўшы, паўстанцы стаялі ў дзвярах. / Нават воі Касцюшкі былыя, / Што прайшлі ўсе агні, агрубелі ў баях, / Слёз сваіх не хавалі, сівыя... / Там ляжаў ён на лаве – у спакоі чало. /У руках яго крыж, збоч нягнуткі / Нож-кінжал і ружжо, ва ўзгалоўі – сядло. / Люд дзівіўся: такі маладзюткі! /Ды чаму твар дзявочы ў байца? Два грудкі... / Хто ж мог знаць, што баёў завадатар / Быў... дзяўчынай! Была – слёз не трэба, жанкі, – / То ліцьвінка Эмілія Плятэр!» [3, с. 252–253].

Сто восемдзясят чатыры гады таму перастала біцца палымянае сэрца беларускай Жаны д'Арк (і так называлі Эмілію сучаснікі), але ў памяці беларускага, латвійскага, літоўскага, польскага народаў яе імя і подзвіг жывуць і сёння. У горадзе Капчамесціс у 2004 г. на яе магіле ўстаноўлены гранітны абеліск. У цэнтры горада ўзвышаецца помнік Эміліі. На яго пастаменце – цытата з верша А. Міцкевіча «Смерць палкоўніка». У шэрагу гарадоў імем нашай суайчынніцы названы вуліцы. У гады Другой сусветнай вайны імя Эміліі Плятэр было прысвоена аднаму з жаночых батальёнаў 1-й пяхотнай дывізіі імя Т. Касцюшкі.

Жыццё і дзейнасць гераіні паўстання 1830–1831 гг. знайшлі пэўнае адлюстраванне таксама ў беларускіх энцыклапедычных і навукова-папулярных выданнях [1, 4, 5]. У яе гонар у нашай краіне ладзяцца розныя імпрэзы. Так, у 2011 г. у Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка адбылася выстава, прысвечаная Эміліі Плятэр. 18-ты Драздовіцкі пленэр, што традыцыйна праводзіцца на Браслаўшчыне, быў прысвечаны 205-годдзю з дня нараджэння легендарнай гераіні.

Імя Эміліі Плятэр не сцерлася з памяці еўрапейскіх народаў, і спадзяёмся, што і для будучых пакаленняў яно застанецца сімвалам бязмежнай любові да Айчыны, за якую, калі спатрэбіцца, можна аддаць жыццё.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Грыцкевіч, А.** Паўстанне 1830–1831 / А. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 5. М – Пуд / Беларус. энцыкл. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 447–448.
2. **Кісялёў, Г. В.** Радаводнае дрэва / Г. В. Кісялёў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 303 с.
3. **Міцкевіч, А.** Смерць палкоўніка / А. Міцкевіч // Вершы і паэмы / уклад. А. Клышкі і К. Цвіркі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 247–248.
4. **Плятэр Эмілія Францаўна** (13. 11. 1806–23. 12. 1831) // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X–XIX стагоддзі: энцыкл. давед. / склад. Г. А. Масалыка; гал. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 527–528.
5. **Швед, В.** Броэль-Плятэр Эмілія Францаўна / В. Швед // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 5. М – Пуд / Беларус. Энцыкл. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 515.
6. **Швед, В.** Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны / В. Швед. – Гродна, 1995.
7. **Dameyko, I.** Moje podroze / I. Dameyko. – Wroclaw – Warszawa – Krakow, 1962. T. 1. – 364 s.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ